Юбіляру-АБВШ падшэфнай ЛКСМБ—
БАЯВОЕ КОМСАМОЛЬСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ!

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 33 (1302) | АЎТОРАК, 10-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

КОМСАМОЛЬЦЫ! У ПЕРАХВАТ, НА РАМЕНЬ ВІНТОЎКУ!

МО ЗАЎТРА ЛЯ МЯЖЫ ПРАКЛІЧУЦЬ ТРУБЫ ЗБОР

Усесаюзныя манэўры—экзамен баявой падрыхтаванасьці комсамолу

Усім РК і ячэйкам ЛКСМБ аб правядзеньні XIII гадавіны РСЧА

XIII гадавіна РСЧА—23 лютага г.—праходзіць у абставінах усё большага і большага росту ваеннай бясьпекі супроць Савецкага Саю-.

IX зьезд УсеЛКСМ і X ЛКСМБ, падставе разгорнутай самакрытыкі, ускрылі рад недахопаў у вайсковай рабоце КСМ і з выключнай р'ёзнасьцю паставілі пытаньне аб мацненьні баявой падрыхтоўкі мсамолу.

XIII-ю гадавіну РСЧА мы павінны азнаймаваць:

Мобілізацыяй пільнасьці і ўвагі мсамолу і рабоча-сялянскай моладзі вакол узросшай і ўсё ўзрастаючай небясьпекі ваеннага нападу перыялістых на Савецкі Саюз; на мацненьне абароназдольнасьці краіны, падвышэньне баявой і тэхнічнай моцы Чырвонай арміі, на праджаньне ўсёй комсамольскай организацыяй абавязковага вайсковага навучаньня і вывучэньня аднае з вайсковых спэцыяльнасьцяй.

Шырока азнаёміць комсамольцаў, рабочых, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкую моладзь з гісторыяй і сучасным становішчам РСЧА, з ўдзелам КСМ у яе будаўніцтве; праверыць, організацыйна ўпарадкаваць і ўмацаваць сувязь з часткамі Чырвонай арміі праз узаемныя масавыя наведваньні, супольныя вечары; скласьці ўмовы на соц. спаборніцтву вытворчых, колгасных і савгасных ячэек з вайсковымі часткамі на пасьпяховае выкананьне сваіх плянаў.

Комсамольскім організацыям вайсковых частак узяць на сябе ініцыятыву на ваенізацыі грамадзянскіх організацый, як шляхам праходжаньня абавязковага вайсковага навучаньня, так і спэцыяльных відаў заняткаў. Мобілізаваць увагу комсамолу і працоўнай моладзі на выкананьне рашэньняў IX зьезду УсеЛКСМ аб шэфстве над Авіа-флётам, прапагандаваць значэньне яго, разгарнуць работу па збору сродкаў на пабудову самалёту імя X зьезду ЛКСМБ і пабудову зьвяна самалётаў імя беларускага комсамолу, шырока прапагандаваць задачы падрыхтоўкі вайсковых кадраў і закончыць набор кандыдатаў у авіа-школы. Організаваць лепшымі ўдарнікамі, рабочымі, батракамі і колгасьнікамі пасылку таварыскіх справаздачных лістоў аб сваёй рабоце на лінкор „Парыская Комуна", пасылку падарункаў выканаўшы поўнасьцю разьвёрстку ЦК на пабудову падводнай лодкі „Комсамолец".

Правесьці раённыя зьлёты вайсковых організатараў ячэек і конфэрэнцыі комсамольцаў вывучаючых вайсковую справу, на якіх паставіць даклады: 1. аб выніках і далейшых задачах работы КСМ у справе ваенізацыі, 2, аб удзеле ЛКСМБ у падрыхтоўцы да асеньніх усеармейскіх манэўраў; прапрацаваўшы прамову т. Варашылава на IX зьезьдзе УсеЛКСМ.

У раённых, заводзкіх шматтыражках і насьценгазэтах шырока асьвятляць пытаньні, зьвязаныя з гадавінай Чырвонай арміі.

Правесьці масавы агляд вайсковай работы ЛКСМБ і вечары прапаноў па палепшаньню работы і кіраўніцтва ёю.

Сакратар ЦК ЛКСМБ—Гуткін.
Заг. вайсь. аддзелу ЦК Гузікаў.

РЭАЛІЗУЕМ МАРШРУТЫ БАЯВОЙ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ

Першы маршрут

Да гадавіны Чырвонай арміі праверыць стан вывучэньня вайсковай справы комсамольцамі заводаў, фабрык, колгасаў, савгасаў, устаноў і сак.

Разам з гэтым праверыць удзел комсамольцаў у таварыствах Асоавіяхэму, Аўтадору і МОПР'у. Дамагчы армейскаму комсамолу пабудавацца з груп садзейнічаньня ячэйкі.

Правесьці да гадавіны Чырвонай арміі сходы, мітынгі і гутаркі па пытаньню аб пагрозе вайны супроць СССР і прапрацаваць рашэньні зьездаў аб абавязковым вайсковым абучэньні комсамольцаў.

Організаваць ваенізаваную лыжную вылазку грамадзянскіх комсамольцаў сумесна з армейскім комсамолам.

Усю гэтую працу праводзіць пад лёзунгам: „Ніводнага комсамольца, ніводнай комсамолкі па-за вайсковай вучобай".

Разгарнуць ва ўсю шырыню вайсковую працу. Вылучыць па колективах комсамолу брыгады, па ячэйках паасобных таварышоў, адказных за працу вайсковых гурткоў. Гэтыя брыгады і паасобныя таварышы павінны забясьпечыць бесьперабойную працу да 13 гадавіны Чырвонай арміі і ў час яе правядзеньня наладзіць гутаркі на тэмы, якою будзе надыходзячая вайна, тэхнічнае ўзброеньне і задачы рацыяналізацыі арміі.

Азнаёміць комсамол з казарменым бытам Чырвонай арміі.

Другі маршрут

Для комсамольцаў, якія маюць мінімальныя вайсковыя веды, організаваць гурткі другой ступені па вывучэньню вайсковай справы.

З 1-га па 15 мая праверыць як усвоены програмы першай ступені вайсковага навучаньня

Для адстаючых комсамольцаў організаваць буксіры ў дапамогу ім. Правесьці конкурсы на лепшае ўсваеньне програм.

Да 15 мая комсамольцы павінны закончыць падрыхтоўку адзіночнага байца.

Правесьці збор рацыяналізатарскіх прапаноў па палепшаньню вайсковай справы.

Трэці маршрут

З 15 мая да 1-га лістапада комсамольцы павінны прайсьці курс у аб'ёме аддзяленьня, узводу, кулямётнага і гарматнага разьдзелу. Ня менш двух разоў удзельнічаць у атрадных занятках.

На аснове конкурсу—райкомы павінны адабраць лепшых і організаваць з іх баявыя ўдарныя атрады, для ўдзелу ў асеньніх манэўрах Чырвонай арміі.

Зараз-жа прыступіць да рэалізацыі адзначаных 3-х маршрутаў баявой падрыхтоўкі—першачарговая задача комсамолу Беларусі.

У дзень X гадавіны АБВШ адчыняецца другі ўсебеларускі зьезд Асоавіяхэму. Комсамольская організацыя Беларусі ставіць перад зьездам пытаньне аб падрыхтоўцы да манэўраў, каб зьезд даў пэўную ў гэтай галіне дырэктыву Асоавіяхэмаўскім організацыям.

Армейскі комсамол павінен удзяліць максымум увагі на дапамогу грамадзянскім організацыям аўладаць вайсковай справай.

Асеньнія манэўры Чырвонай арміі імя Варашылава будуць баявым экзаменам для падрыхтоўкі комсамольцаў у галіне ваенізацыі. Мы ўпэўнены, што традыцыі комсамольцаў грамадзянскай вайны з гонарам будуць трымацца комсамольцамі рэконструкцыйнага пэрыяду.

На заклік партыі і ўраду стаць на абарону бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту, комсамол павінен адказаць:

Мы гатовы абараняць краіну Саветаў.

Рэдакцыя „Чырвонай Зьмены"

9 лютага 31 г. за подпісамі старшыні Савнаркому СССР тав. Молатава і сэкратара ЦК УсеКП(б) тав. Сталіна публікавана адозва Савнаркому СССР і ЦК УсеКП(б) да усіх партыйных, савецка-гаспадарчых, водна-транспартных, профсаюзных і комсамольскіх організацый аб лясным транспорце.

Поўны тэкст адозвы СНК і ЦК УсеКП(б) будзе зьмешчаны ў чарговым нумары газэты „Чырвоная Зьмена".

АБВШ узнагароджана Ордэнам Чырвонага Сьцягу

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Да 10-годзьдзя існаваньня Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР

10-га лютага 1931 г. спаўняецца дзесяць год існаваньня Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР. Заснаваная ў часы грамадзянскай вайны, Аб'яднаная Школа за час яе існаваньня адыграла вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі чырвоных камандзіраў для нацыянальных і тэрытарыяльных вайсковых частак. Рыхтуючы для Чырвонай арміі загартаваных чырвоных камандзіраў з лепшых рабочых, батракоў, сялян-беднякоў і актывістых серадпякоў, Аб'яднаная Школа дала за гэты час Чырвонай арміі сотні клясава-сьвядомых, узброеных палітычнымі і ваеннымі ведамі і адданых рабочай клясе ў барацьбе за соцыялізм камандзіраў, і гэтым з гонарам выконвала сваю задачу—узмацненьня боездольнасьці Чырвонай арміі і абароназдольнасьці Савецкай краіны.

Адзначаючы выдатныя заслугі Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР у справе падрыхтоўкі чырвоных камандзіраў, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. Узнагародзіць Аб'яднаную Беларускую Вайсковую Школу Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу.

2. Адзначаючы заслугі політычна-каманднага складу Школы ў справе добрай падрыхтоўкі вайсковых кваліфікаваных кадраў, узнагародзіць:

а) аружжам і граматамі ад Прэзыдыуму ЦВК БССР наступных асоб з політычна-каманднага складу:

Васілевіча І. І., Конюхава Н. Г., Вяршэню П. Н., Ветнікава Я. Г., Уласава М. С., Леавенка, Гаранскага, Пронька, Якубовіча, Міларадава, Казлоўскага, Пякурына, Караўлава, Храбрага, Уласава С., Ачкасава, Гарбатава, Дабралюбава, Федаровіча,

б) Пачэснымі граматамі ЦВК БССР наступных асоб з політычна-каманднага складу.

Жырковіча, Балотнікава, Побылеца, Ганчарыка, Сырэца, Герваноўскага, Гарошка, Гусева, Раманава, Кавалёва, Ермакова, Савінава, Пельверта, Парынскага, Брэхава, Хутарцова, Грабоўскага.

Узнагародзіць пачэснай граматай Прэзыдыуму ЦВК наступных курсантаў школы, як праявіўшых сябе клясава-вытрыманымі, політычна-сьвядомымі, найболып старанымі ў справе падрыхтоўкі да высокага званьня чырвонага камандзіра:

Сянкевіча Пятра, Літвінава Пятра, Ярмолава Ўладзімера, Фролава Марку, Лістрацэнку Базыля, Базыленку Ўладзімера, Казакевіча Паўла, Фролава Антона, Філончыка Тодара, Ляшчынціна Базыля, Кіяшку Мікалая, Котава Івана, Маргелава Базыля, Казлова Луку, Дзеркача Івана, Удотава Алеся Мазюка Зьмітра, Барадулькіна Рыгора.

Прэзыдыум ЦВК выказвае ўпэўненасьць, што выхаванцы АБВШ імя ЦВК, атрымаўшы бальшавіцкую закалку і вайсковую падрыхтоўку ў школе пад кіраўніцтвам лепшых настаўнікаў—удзельнікаў грамадзянскай вайны, будуць на належнай вышыні свайго пачэснага званьня чырвоных камандзіраў і з гонарам выканаюць свой баявы абавязак на абароне пролетарскай рэволюцыі ў час, калі гэтага ад іх патрабуе комуністычная партыя і Савецкі ўрад.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
Чарвякоў

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. Хацкевіч

9—II-31 г.
г. Менск

Усім організацыям і таварышом, прыслаўшым прывітаньні з прычыны 50-й маёй гадавіны

Таварышы, я не знаходжу давольні моцных слоў для адказу на шматлікія прывітаньні, якія паступаюць на маё імя. Ведаю, што мая кляса і яе авангард—наша ленінская партыя—зьяўляюцца адзінымі „вінавайцамі" майго становішча ў гэтыя дні.

Ім—рабочай клясе і партыі—перш за ўсе і належыць той гонар, які быў мне аказаны працоўнымі.

Апошнія пяць год па волі партыі і рабочае клясы я кірую узброенымі масамі дзяржавы. Гэтую невыпадковую адказную працу я меў магчымасьць выконваць толькі дзякуючы сталаму кіраўніцтву Ленінскага ЦК і таму, што сумесна са мною цесна і з энтузіязмам працавалі ўсе камандзіры, політработнікі і ўвесь чырвонаармейскі склад Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі. І дзеля гэтага ім—чырвонаармейцам, камандзірам і політработнікам—таксама была аказана тая ўвага, якой узнагароджваюць мяне таварышы да майго 50-годзьдзя.

Мяне выхавалі партыя і яе будаўнік — Ленін. Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК і ў сталай сувязі з верным вучнем Леніна і прадоўжнікамі яго спраў тав. Сталіным я працаваў усе гады. Я буду працаваць і ў далейшым, аддаючы ўсе сілы, а калі патрабуецца, і ўсяго сябе за партыю, за пролетарскую справу, за комунізм.

З таварыскім прывітаньнем—
ВАРАШЫЛАЎ

ДРАЦЦА за лён і пяньку

Зьмесьці са шляху нядолеўшых і не жадаючых мобілізаваць масы на барацьбу за лён, праводзячых праваапортуністычную практыку

ГАНЕБНЫЯ ЛІЧБЫ

Барысаў, 9. (Па тэлефону ад нашага юнкора)—Ільназагатоўкі па Барысаўскім раёне праходзяць надзвычайна марудными тэмпамі, заданьне загатовіць 170 тон лёну выканана толькі на 11 проц. Колгасы, якія павінны здаць 26,4 проц. раённага заданьня, здалі толькі 0,2 проц.

Двухдзённік штурму і прыезд брыгады ЦК УсеКП(б) разварушылі раённыя організацыі.

Райком комсамолу выслаў 25 чалавек у сельсаветы раёну. Выехалі таксама брыгады ад РК КП(б)Б, профсаюзаў і РВК.

Прыняты яшчэ цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія павінны забясьпечыць выкананьне пляну ільназагатовак. **Кугель**

Ільназагатоўкі пад ударам

Плешчаніцы 9-II (па тэлеграфу ад нашага юнкора)—Ход ільназагатовак па Плешчаніцкім раёне падае зусім трывожныя весткі.

Замест 140 тон ільна-валакна загатоўлена толькі 45 тон.

К лгасы здалі ўсяго 12 тон. У шэрагу колгасаў маюцца факты спажываньня лёну (колгас „Іскра" і інш.).

Ганебна адстаюць у ільназагатоўках Хатаевіцкі, Ганцаўскі і Заполь·скі сельсаветы. У гэтых сельсаветах заданьні не давезены да кулацка-заможных двароў.

Райкоопсаюз дрэнна праводзіць загатоўкі.

Ячэйкі Л СМБ да апошняга часу зусім нічога не рабілі па ільназагатоўках і толькі пасьля тэлеграмы ЦК ЛКСМБ, РК высылаў брыгаду ў ячэйкі.

Неабходна жорстка ўдарыць па апартуністых—зрыўшчыках ільназагатовак і спажывецкіх тэндэнцыях колгасаў.

Гельфман

Стара-дароскія опортуністы зрываюць загатоўкі

СТАРЫЯ ДАРОГІ. 9-II (Ад нашага карэспондэнта).—Ільназагатоўкі па Стара-Дароскім раёне праходзяць нездавальняюча. Права-опортуністычная стаўка на самацёк і недаацэнка гэтай важнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі сельскімі саветамі і раённымі організацыямі зрывае выкананьне пляну ільназагатовак.

Райкоопсаюз і Спажывецкае таварыства павінна загатовіць у 1930-1931 годзе: ільна-валакна 750 цэнтнераў, ільнанасеньня 1200 цэнтнераў і 100 цэнтнераў пянькі.

Але гэтае заданьне выконваецца зусім дрэнна. Ільвавалакна нарыхтавана толькі 87,7 цэнтнераў, або 11 проц. гадовага пляну; ільна-насеньня—675,28 цэнт., або 56 проц. пляну, плян пянькі выканан толькі на 2,14 проц.

Гэтыя весткі гавораць аб рэальнай небясьпецы на фронце ільназагатовак у раёне.

Загатоўчыя організацыі бяздзейна адносяцца да выкананьня кантрольных заданьняў па загатоўцы. Райкоопсаюз ускладае ўсю працу па загатоўках на спажыв. таварыствы, апошнія ўзвальваюць на райкоопсаюз.

Старшыня райкоопсаюзу, тав. Фікс, гаворыць: „Наша справа—сабраць весткі па ўсім раёне і даць РВК, а там—працуй каму патрэбна".

Такія разважаньні прывялі да таго, што ні райкоопсаюз, ні спажывтаварыствы не кантралююць сельсаветаў, як выконваюць яны заданьні па загатоўцы лёну.

Спажыв. кооперацыя злоўжывае тымі фондамі, якія адпушчаны на прэміяваньне здатчыкаў лёну. Тавары даюцца тым, каму не належыць. Гэта ў значнай ступені паслабляе тэмпы ільназагатовак. Сельсаветы на гэтым адказным вучастку працы значыцца бязьдзейнічаюць. Сярод бядняцка-серадняцкага насельніцтва зусім не праводзіцца растлумачальная праца аб значэньні ільназагатовак і шпарчэйшым выкананьні пляну.

Новадароскі і Шчыткаўскі сельсаветы зьнізілі тэмпы.

Яшчэ горш выконваюцца цьвёрдыя заданьні ільназагатовак у кулацкіх гаспадарках. Плян выкананы толькі на 65 проц.

Ёсьць кулацкія гаспадаркі, што зусім адмаўляюцца выконваць цьвёрдыя заданьні. На гэты час кулацкія гаспадаркі здаюць такія самыя нормы, як і бядняцка-серадняцкія.

Сельсаветы не прынялі ніякіх мер, каб прыцягнуць іх да адказнасьці за невыкананьне заданьняў па ільназагатоўках. Пасіўна і іншыя сельсаветы адносяцца прымірэнча да кулакоў: „Кулак мае столькі зямлі, сколькі і бядняк, таму ён не можа выканаць цьвёрдага заданьня".

Такая опортуністычная практыка паасобных сельскіх саветаў зрывае пасьпяховае выкананьне загатоўчых плянаў. Да сельскіх саветаў, якія адкрыта бязьдзейнічаюць і вырываюць класавую лінію, РВК ніякіх захадаў не прыняў.

Немагчыма не закрануць і комсамольскую організацыю Стара-Дароскага раёну.

Ячэйкі ўсю працу ўскладаюць на сельскія саветы, а самі ўвільваюць.

Сярод паасобных комсамольцаў і комсамольскіх ячэек маюцца праваопортуністычныя думкі: „навошта прыцягваць кулакоў да адказнасьці за невыкананьне цьвёрдых заданьняў, калі яны па меры магчымасьці стараюцца выконваць пляны ільназагатовак", „навошта сьпяшацца, яшчэ пасьпеем" (Супінская, Крываносаўская ячэйкі).

Двухтыднёвік штурму па л квідацыі прарываў на фронце ільназагатовак і пасьпяховым выкананьні заданьняў **праходзіць без удзелу комсамольскіх ячэек.**

А. Заслаўскі.

РАЙКОМ І ЯЧ-КІ СТАЯЛІ Ў БАКУ

Слуцак, 9 (Па тэлефону ад нашага юнкора).—Райком комсамолу і комсамольскія ячэйкі раёну ніякага ўдзелу не прымалі ў выкананьні пляну ільназагатовак. Толькі сёньня РК мобілізуе брыгады для дапамогі сельсаветам выканаць плян загатовак лёну.

Прыбытак

ВЫКАНАЦЬ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ аб палепшаньні работы сампрамкоопэрацыі

Перабудаваць работу сярод моладзі сампрамкоопэрацыі, пранізаўшы яе соцспаборніцтвам, ударніцтвам, рацыяналізатарскімі мерапрыемствамі

Нанесьці руйнуючы ўдар па опортуністычнай недаацэнцы ролі сампрамкоопэрацыі

Сёньня пры Белсампрамсаюзе адчыняецца 1-я ўсебеларуская нарада працаўнікоў комсамолу ў прамкоопэрацыі.

Роля прамкоопэрацыі на даным этапе соцыялістычнага будаўніцтва была вызначана ў рашэньнях XVI зьезду УсеКП(б).

Перабудаваць сваю работу

У рэзолюцыі па дакладу т. Куйбышава аб выкананьні пяцігадовага пляну прамысловасьці пра прамкоопэрацыю сказана наступнае:

„Пад кутом погляду ўзмацненьня скарыстаньня наяўных вытворчых магчымасьцяй павінны быць устаноўлены і ўзаемаадносіны паміж буйнай дзяржаўнай прамысловасьцю і прамысловасьцю дробнай, мясцовай і саматужнай. Дробная, мясцовая і саматужная прамысловасьць, у прыватнасьці кооператыўная, разьвіваючы вытворчасьць рыначных вырабаў, павінна разам з тым служыць дадаткам да буйнай прамысловасьці, вытвараючы па яе заказаньнях рад дэталяў і паўфабрыкатаў і аслабаняючы тым самым абсталяваньне буйной прамысловасьці ад такіх вытворчых опэрацый, якія могуць быць зроблены ў дробных саматужных і рамесьніцкіх прадпрыемствах".

Вырашэньне пастаўленых XVI партзьездам перад прамкоопэрацыяй задач патрабуе ад прамкоопэрацыі перабудовы ўсёй работы на новыя формы і мэтоды. Аднак, трэба адзначыць, што комсамольскія організацыі да гэтага часу не ўясьнілі сабе ролі прамкоопэрацыі і рашэньне зьезду па гэтаму повадзу, а з другога боку не забясьпечылі ў дастатковай ступені мобілізацыю ўсёй масы моладзі прамкоопэрацыі на выкананьне пастаўленых XVI зьездам задач перад прамкоопэрацыяй.

Комсамольскія організацыі недастаткова мобілізавалі саматужную моладзь на барацьбу з праявамі правага опортунізму і левых загібаў, недаацэнкай работы з беднатой і батрацтвам у прамкоопэрацыі.

Мы наглядалі моманты, калі пры прыёме саматужнай моладзі ў комсамол, комсамольскія організацыі падыходзілі фармальна, механічна рэгулюючы соцыяльны склад прыйманых у комсамол.

Так м чынам, саматужнай моладзі, якая працуе ў агульных майстэрнях, амаль што зачыняюць доступ у комсамол, незалежна ад соцыяльнага паходжаньня і сучасных умоў работы гэтай моладзі (з матар'ялу да дакладу на бюро ЦК ЛКСМБ аб задачах комсамолу па рабоце сярод саматужна-рамесьніцкай моладзі).

Аб чым гавораць лічбы?

На 1-ае студзеня 29 г. моладзь ў прамкоопэрацыі складала да агульнага ліку кооперавацых—17,4 проц, на -XII 30 г.—14,9 проц. Ня гледзячы на некаторы рост абсолютных лічбаў за 2 гады (з 3144 да 5342), удзельная вага моладзі ў сампрамысловасьці паменшылася з 17 да 14 проц. Рост кооперавацьня моладзі адстае ад агульных тэмпаў кооперавацьня прамоўнага насельніцтва.

На 1-XII-30 г. у дэфіцытных промыслах моладзь складала 17 пр, у недэфіцытных—12 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што Райсаюзы не заняліся сур'ёзна пытаньнем пераключэньня моладзі на недэфіцытныя промыслы.

Райсаюзам неабходна, пры ўдзеле і пад кантролем партыйных, комсамольскіх і грамадзкіх організацый, у бліжэйшы час форсаваць кооперавацьне моладзі на недэфіцытнай сыравіне, уцягваючы колгасьнікаў і батрацка-бядняцкую частку ў арцелі, прымяняючы цэлы шэраг ільгот у растэрміноўцы паю.

Рыхтаваць кадры

Ня лепш справа з бронь-вучнёўствам у прамкоопэрацыі БССР.

За апошнія гады ўкарненьне вучнёўства ішло галоўным чынам у промыслах, працуючых на дэфіцытнай сыравіне (кравецкі, шавецкі, і металяапрацоўчы), якое складала 77 проц., у астатніх промыслах на 1-X 28 г.—23 проц. Хаця за апошні час мы наглядаем некаторы перагом, усё-ж процант вучнёўства ў недэфіцытных промыслах працягвае заставацца мізэрным.

Пастаноўка навучаньня ў сыстэме прамкоопэрацыі нездавальняючая. Большасьць вучнёўства ахоплена індывідуальнымі формамі, ня гледзячы на цэлы шэраг дырэктыў і пастаноў аб пераключэньні навучаньня на брыгадны мэтод.

Гэткія важныя мерапрыемствы, як організацыя школ саматужнага вучнёўства па тыпу ФЗВ, не знашлі належнага адбітку ў сыстэме прамкоопэрацыі. Хаця мы і маем ў паасобных гарадох БССР (Менск, Бабруйск) пераход з індывідуальнага на брыгадныя мэтоды навучаньня, але гэтага мала.

Профорганізацыі не зацікаўлены працай сярод вучняў у прамкоопэрацыі. Нярэдкі моманты, калі вучняў ня прымаюць у саюз.

Лепш справа з зарплатай сярод вучнёўства. Напрыклад: сярэдняя зарплата членаў арцелі (Менск) 101 руб. моладзі—98 руб., вучня—35 руб. і г. д. Горш у вёсках і мястэчках. Неабходна адзначыць, што раённыя камітэты КСМ у паасобных мясцох, ведаючы аб гэтым, своечасова не рэагавалі. Не меншая віна ў гэтым і райпрамсаюзаў.

За маладзёжныя арцелі

Пастанова ЦК Усе КП(б) ад 5—XII-29 г. аб організацыі арцеляй з беспрацоўнай моладзі не прымянялася як сьлед ва ўмовах прамкоопэрацыі БССР.

Практыка організацыі арцеляй з моладзі (арцель імя 16-га МЮД'у) поўнасьцю сябе апраўдвае. Моладзь выявіла сябе даволі актыўнай ў выкананьні прамфінпляну. Перад прамкоопэрацыяй высоўваецца задача: у далейшым больш фарсаваць організацыю арцеляй з моладзі, зварочваючы галоўную сваю ўвагу на мястэчкі і вёскі.

Дырэктыва ЦК КП(б) аб організацыі груп беднаты ў сыстэме прамкоопэрацыі не паўсюды выканана. Задача моладзі ў далейшым зьвярнуць больш увагі на гэты важны вучастак работы, які мае політычнае значэньне.

За апошні час у паасобных райсампрамсаюзах (Бабруйск, Менск) форма соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва набыла шырокі размах, даўшы цэлы рад дадатных вынікаў у сэнсе зьніжэньня сабекошту, павышэньня вытворчасьці працы і г. д. Побач з дасягненьнямі, мы наглядаем ілжэ-ўдарніцтва і моманты соцспаборніцтва і ўдарніцтва толькі на паперы.

Падрыхтавацца да другой бальшавіцкай

Нарада пры зеўца сур'ёзна заняцца пытаньнем падрыхтоўкі да 2-й бальшавіцкай вясеньняй пасяўной кампаніі, якая павінна будзе адыграць вялізарную ролю ў правядзеньні колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Сампрамкоопэрацыя мае вялікае значэньне ў дапамозе сельскай гаспадарцы: рамонт с. г. інвэнтару, пачынка абутку і г. д. Комсамолу, усім работнікам сампрамкоопэрацыі прыйдзецца весьці самую рашучую барацьбу з момантамі опортуністычнай недаацэнкі вясеньняй пасеўнай кампаніі і ўдзелу ў ёй моладзі.

Нажаль, трэба констатаваць, што ня зусім здавальняюча пастаўлена ў сампрамкоопэрацыі, асабліва сярод моладзі інтэрнацыянальная работа. Саматужная моладзь ня была як сьлед мобілізавана на барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам, шовінізмам і антысэмітызмам. Мы мелі выпадкі выступленьняў яўрэйскага шавінізму (арцель Мэтраінструмант) і ў Бабруйску. Ячэйкі КСМ і комсамольскія прадстаўнікі райпрамсаюзаў несвоечасова павялі рашучую барацьбу з гэтым.

Адзін з слабых вучасткаў работы моладзі ў прамкоопэрацыі—гэта ваенная работа. Задача нарады даць самую строгую дырэктыву, каб рашэньне 9-га ўсесаюзнага комсамольскага зьезду па ваеннай рабоце было выканана на 100 проц.

Пімман, Галкін

Організаваць усебеларускі конкурс

Каб палепшыць працу ў школах ФЗВ наш комсамольскі калектыў і ўся фабзавучнёўская моладзь прапануе організаваць усебеларускі конкурс на лепшую школу ФЗВ з мэтай прыцягнуць самыя шырокія пласты пролетарскае моладзі і выканаць задачы, пастаўленыя перад ФЗВ у галіне падрыхтоўкі кадраў для соцыялістычнай прамысловасьці.

Высоўваючы ініцыятыву стварыць усебеларускі конкурс, наша школа ФЗВ швэйнікаў у ліку 700 вучняў з свайго боку бярэ на сябе наступныя абавязкі:

1. Школа абавязваецца рэконструяваць сваю працу так, каб палепшыць програмы вытворчай і навучальнай часткі. Перавесьці на новыя мэтоды выкананьня прамфінпляну, шырока разгарнуўшы соц. спаборніцтва і яго конкрэтныя формы: скразныя брыгады, вытворчыя нарады і г. д.

2. Школа абавязваецца даць 6 пр. інструктароў добра падрыхтаваных як практычнымі, так і тэорэтычнымі ведамі, выпусьціць з школы добра кваліфікаваных рабочых па новай тарыфнай сетцы: 4-ы разрад—60 проц., 3-ці—30 проц., другі разрад—10 проц.

3. Інструктары і настаўнікі фабрыкі-школы абавязваюцца на працягу 3-га году цалкам політэхнізавацца шляхам узаемнага навучаньня.

4. Фабрыка-школа абавязваецца трымаць поўную пролетарскую дысцыпліну, зьнішчыць брак, прагулы, абвясьціць рашучую барацьбу лятунам і дэзэртырам пяцігодкі.

5. Школа-фабрыка абавязваецца ўзяць на грамадзкі буксір школу ФЗВ швэйнікаў (Віцебск).

ЦК ЛКСМБ павінен выпрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы для правядзеньня гэтага конкурсу.

З прывітаньнем

Бюро колектыву ЛКСМБ, фабком, адміністрацыя.

НАРОДЖАНАЯ У ГРЫМОТНЫХ БОЙКАХ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

За дзесяць год АБВШ дала Чырвонай арміі сотні клясава-сьвядомых, узброеных палітычнымі і вайсковымі ведамі, адданых пролетарскай рэволюцыі змагароў за соцыялізм—чырвоных камандзіраў

Лепшым падарункам юбіляру ад ленінскага комсамолу—шэфа АБВШ будзе пасылка новых соцен ударнікаў ад варштатаў і колгасных палёў на папаўненьне радоў чырвоных камандзіраў

КОМСАМОЛ АБВШ ДА 10-й ГАДАВІНЫ

Комсамольская організацыя школы да свайго 10-гадовага юбілею прышла адзінай, монолітнай, згуртаванай вакол генэральнай лініі партыі, здольнай пад яе правільным кіраўніцтвам змагацца за соцыялізм.

Комсамол школы, як і ўвесь арміейскі комсамол, прымае актыўны ўдзел у соц. спаборніцтве і ўдарніцтве, змагаецца за вышэйшыя соцыялістычныя формы баявой падрыхтоўкі, за колькасныя і якасныя паказчыкі ў справе павышэньня баявой падрыхтоўкі чым яшчэ раз пацьвярджае, што пастаўленьня РВС задачы з гонарам выконваюцца.

У сваіх шэрагах комсамольскі колектыў мае: снайпераў—101 чалавек, ударных брыгад—3, брыгад энтузіястых-варашылаўцаў—4, ахоплена індывідуальным спаборніцтвам 25 чалавек.

За гэты час комсамольская організацыя давяла, што яна зьяўляецца сапраўдным памочнікам партыі, вядучы рашучую барацьбу з усімі антыпартыйнымі, упадніцкімі і іншымі настроямі

Побач з велізарнейшымі посьпехамі, мы маем цэлы шэраг недахопаў, якія неабходна к Х-й гадавіне выпраўчыць каб зьнішчыць у далейшай рабоце.

1. Ня ўся організацыя ахоплена індывідуальным соц. спаборніцтвам і ўдарніцтвам.

2. Мы маем шмат дысцыплінарных учынкаў з боку комсамольцаў, спазьненьня з гарадзкога водпуску, сон на пасту, спрэчкі з камандзірамі і г. д.

Комсамольская організацыя для зьнішчэньня гэтых недахопаў мобілізавалася.

Абвешчан месячнік штурму па ліквідацыі паасобных прарываў баявой падрыхтоўкі, які даў ужо добрыя вынікі.

Комсамол АБВШ з гонарам выканае тыя абавязкі, якія ўскладае на яго партыя.

ЧАРТОЎ

АБВШ—кузьня чырвоных камандзіраў

Галоўнай задачай для курсантаў АБВШ было выкананьне вучэбнага пляну на 100 проц. і загаду Рэўваенсавету аб баявой падрыхтоўцы.

У першай палове мінулага навучальнага году мы мелі 118 адсталых комсамольцаў, што складала 49,9 проц. усяго складу комсамольскай організацыі школы. Але, дзякуючы правільнай пастаноўцы працы комсамольскага колектыву, на грунце шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва і праведзенага паўтарамесячніка па падцягваньню адстаючых, комсамольская організацыя дабілася значнага павароту тварам да баявой падрыхтоўкі. Зменшылася колькасьць адстаючых да 43 чалавек,—гэта якраз тыя, што прышлі ў нашы шэрагі зусім мала падрыхтаванымі.

У першых шэрагах

Калі спачатку навучальнага году школа давала нізкі процант выкананьня па стральбе у сярэднім да 50—65 проц., (з станковага кулямёту „Максім“—87,8 проц., з ручных кулямётаў - 62,2 проц.), дык спэцыяльная каманда школы на акруговых стралковых спаборніцтвах заняла першае месца па стральбе і атрымала пераходны сьцяг Рэўваенсавету РВА і ганаровую грамату.

Школа па стралковай і тактычнай падрыхтоўцы заняла першае месца сярод часьцей БВА і вайскова-навучальных устаноў РСЧА, за што атрымала прыз СНК БССР—4000 рублёў.

У фізычнай падрыхтоўцы школа таксама дасягнула вялікіх посьпехаў. На гарнізонных спаборніцтвах па шматбор'ю школа ўзяла першае месца. Раз дзел, які прыняў на сябе імя 16 партзьезду, дасягнуў надзвычайна вялікіх посьпехаў —15-кілёметравы пераход з поўнай баявой выкладкай, авалоданьне палявым арадком і паражэньне мішэняй на 90 проц. праведзены за гадзіну і 4 хвіліны.

На ўсеармейскіх спаборніцтвах разьдзел школы па вайскова прыкладнаму шматбор'ю заняў трэцяе месца сярод навучальных устаноў РСЧА, а па санітарнай падрыхтоўцы—першае месца, за што атрымаў ганаровы дыплём і пераходны прыз

На рэйках соцспаборніцтва

Соц. спаборніцтвам і ўдарніцтвам школа ахоплена на ўсе 100 проц. Усе разьдзелы школы зьяўляюцца ўдарнікам імя 3 году пяцігодкі.

Былі і прарывы, асабліва ў галіне дысцыпліны. За апошнія 4 месяцы атрымалі дысцыплінарныя спагнаньні 19 комсамольцаў (46 проц. усяго складу комсамольскай організацыі). Комсамол павёў рашучую барацьбу з тымі, хто парушае дысцыплінарную політыку ў Чырвонай арміі,

Крытыка і самакрытыка ў комсамольскай організацыі пастаўлены на належную вышыню. Уся работа праходзіць пад знакам дзелавой бальшавіцкай самакрытыкі, кожны не ахоп крытыкуецца і абгаварваецца з усіх бакоў.

147—у партыю Леніна

За перыод сваё працы колектыў комсамолу школы ўзрос на 85 новых членаў, у шэрагі партыі перададзены 147 комсамольцаў-ударнікаў. У падарунак 16 зьезду і ў адказ на контррэволюцыйныя вылазкі беспрынцыпнага права-„лявацкага“ блёку комсамол АБВШ адказаў колектыўным уступленьнем у партыю.

На далейшы час уся работа колектыву, як раней, будзе праходзіць у барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе з правымі і „левымі“ опортуністымі і контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам, вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай на гэтым этапе.

Яшчэ больш разгортваючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, мацуючыся за крытыку і самакрытыку ў штодзённым жыцьці, за зьнішчэньне недахопаў у галіне колектывізацыі, комсамол АБВШ прыйдзе да новых перамог

Лёзунг: „АБВШ—на першым месцы па стралкова-тактычнай падрыхтоўцы сярод РСЧА“ за таецца у сіле і на новы навучальны год.

Пры сумеснай працы з шэфам комсамолам Беларусі комсамол АБВШ будзе першым барабанбітом за выкананьне загадаў Рэўваенсавету СССР і загадаў Рэўваенсавету БВА па баявой падрыхтоўцы будучага чырвонага камандзіра РСЧА.

Курсанты АБВШ ВАЙТОВІЧ Якуб.
ЯКЮЧЭНЯ Мікола.

Начальнік Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы тав. ВАСІЛЕВІЧ

Заўжды першымі

4 гады 2-ая рота АБВШ трымала першынства па лыжна-стралковай падрыхтоўцы. 4 гады выдатныя курсанты-лыжнікі і стралкі змагаліся за лепшыя паказчыкі лыжнай і стралковай падрыхтоўкі.

Разьдзел, у спаборніцтве на лыжах за стральбою, праходзіў 25 кілёметраў за тры гадзіны і 6 хвілін паражаючы мішэнь на 100 проц.

Ленкуток другой роты упрыгожваецца рознымі прызамі, граматамі, дыпкёмам, якія характарызуюць выдатнасьць другое роты.

Вакуёй гэтай працы заслугоўвае асаблівае увагі лепшы ўдарнік і організатар лыжна-стралков й справы другой роты—тав. Ганчарык, які зьяўляецца курсантам камандзірам, усю энэргію і вольны час ён аддае баявой падрыхтоўцы курсантаў. Пад яго кіраўніцтвам другая рота 4 гады трымае першынства. Тав. Ганчарык абвясьціў сябе ўдарнікам і ўзяў на сябе шэраг конкрэтных абавязкаў, выклікаўшы на спаборніцтва астатніх таварышоў

Вайскор Алесь Налівайка

За пяцігодку ў 4 гады

Улічваючы тое велізарнае значэньне, якое мае ў сучасны момант—мобілізацыя сродкаў, наша школа к 10-й гадавіне свайго існаваньня падыходзіць са значнымі посьпехамі ў гэтай галіне.

Падпіска на пазыку „Пяцігодка—ў 4 гады“ дала 25.500 руб што складае 105 проц. месячнага акладу. Падпіскай ахоплен увесь склад школы.

Па ашчаднай справе мы маем укладаньняў на суму 19.854 рублі, з агульнай колькасьцю ўкладчыкаў: начсклад—92 проц., курсанты Артдывізіёну 73 проц., чырвонаармейцы—62,5 проц., курсанты пяхотнага батальёну—53,4 проц., вольнанаёмныя—47,5проц.

Кантрольнае заданьне за асобы квартал 1930 г. выканана на 100 пр. Паступіла за гэты пэрыод новых укладаў на суму 8.005 р., прычым школа вышла на першае месца сярод іншых вайсковых частак як па агульнай суме ўкладаў, так і ў сэнсе выкананьня заданьня.

За студзень школа дала новых укладаў 2.200 руб., апрача тэй лічбы, якая была на 1 студзеня.

Гэтыя посьпехі нам трэба замацаваць уцягнуўшы тых, хто яшчэ не зьяўляецца ўкладчыкам, даўшы новыя тысячы рублёў на ажыцьцяўленьне лёзунгу „пяцігодка—ў 4 гады“.

Смоліч.

Так растуць камандзіры

Тэрмін навучаньня у Аб'яднанай Беларускай Вайсковай школе—тры гады. Кожны год навучаньня мае пэўную мэтавую ўстаноўку ў падрыхтоўцы курсанта на камандзіра.

Мэта першага году навучаньня падрыхтаваць з курсанта адзіночнага байца, каб ён умеў добра дзейнічаць у баі у складзе аддзяленьня і здолеў замяніць у кожную хвіліну камандзіра аддзяленьня, а ў політычных адносінах,—падрыхтаваць групавіка гэтага аддзяленьня, актывістага.

Мэта другога году навучаньня падрыхтаваць камандзіра стралковага і кулямётнага аддзяленьняў, здольнага кіраваць імі у час бойкі і замяніць камандзіра разьдзелу. У політычных адносінах—падрыхтаваць групавода для праведзеньня політычных заняткаў з чырвонаармейцамі.

Мэта 3-га году навучаньня-падрыхтаваць з курсанта камандзіра стралковых, кулямётных і батальённай артылерыі разьдзелаў, здольнага ў мірны час і на вайне кіраваць імі як у паасобных дзеяньнях, так і ў складзе рот і батальёнаў, у складаных формах баявых дзеяньняў, а таксама здольнага ў мірны час і на вайне замяніць камандзіра роты.

Школа рыхтуе камандзіраў РСЧА, якія змогуць, набыўшы шырокую спэцыяльнасьць у вайсковай справе, сапраўды справіцца з ўскладзенымі на іх задачамі.

Кандыдацкі контынгент, які папаўняецца АБВШ, мае нізкую агульную асьвету: сельскае школы, а нават і ніжэй. Такім курсантам у першы год навучаньня, а таксама і на працягу другога году, школа ідзе на дапамогу і высоўвае для праходжаньня агульна-адукацыйныя дысцыпліны, роўныя па некаторых галінах курсу 7-годкі.

Сядзець у габінэце, слухаць лекцыі выкладчыкаў, чытаць кнігі, блытацца ў картах і плянах, наогул вывучаць тэорыю—справа адна і справа зусім простая. Але вынікі могуць быць дрэнныя, калі курсанты ня ўвяжуць тэорыі з практыкай, бо „тэорыя без практыкі—мёртвая“, асабліва ў вайсковай справе.

Кожная лекцыя тактыкі распрацоўваецца практычна ў полі дзе курсанты, у ролі сярэдніх і малодшых камандзіраў выконваючы пастаўленыя баявыя задачы, фактычна набываюць практыку ў камандваньні разьдзеламі ў час баявой абстаноўкі.

Кавальчук.

Стральба з кулямёту па самалётах і стральба ...

Працоўны дзень курсанта

Восем гадзін раніцы. Гучна разносіцца галасісты ражок. Пад'ём... —Чуваць голас днявальнага. Як адзін—на нагах. Хутка накінулі вопратку, прыбралі ложкі.

Пагулянка 15 хв. Добра падыхаць сьвежым паветрам. Спорт. Гімнастыка.

Пасьля ранішняй зарадкі ўбягаюць курсанты ў пакоі. Натоўп ля душа. Сьмех Жарты. Прыемны пах усялякіх колераў туалетнага мыла разносіцца па ўмывальні. Усюды вэнтыляцыя. Здаровае паветра.

Сыгналы на гарбату. Пастроіліся. Ланцужком выцягнуліся шэрэнгі. У сталоўцы ўжо ўсё гатова. Белы хлеб, кубак, віделец і інш.

9 гадзін—пачатак рабочага дня. Кніжкі, сшыткі, алоўкі захапіў кожны. Сьпяшаюцца ў вучэбны аддзел. Усе разышліся па габінэтах, чакаюць настаўніка. Дзяжурныя на пагатове дакладаюць аб наяўнасьці людзей. З павагай сустракаюць настаўніка. Кароткі адказ на прывітаньне настаўніка:—„добры дзень!“ Заняткі—да 12 гадзіны.

Тады—сьнеданьне.

Зноў на заняткі да 16 гадзін. Пасьля абавязковай чыткі газэт, а 18 гадзіне абед. Суп, рысавая каша, катлеты, другім разам бывае масла каровье і іншая страва. Пасьля абеду абавязкова мёртвая гадзіна. Прыемна адпачыць гадзінку пасьля апэтытнага абеду.

Усе разышліся. Чытаюць газэты, кніжкі, а там у кутку за столікам працуе рэдкалегія ротнай ільлічоўкі. Група курсантаў сабралася ў ленкутку—слухаюць радые. Іншыя скачуць пад гучны гармонік. Сьпевы, самадзейнасьць курсантаў. А там—у бібліотэку, чытальню, буфет і гэтак да 24 гадзін ночы. Пасьля адбой. Здаровы адпачынак пасьля працоўнага дня. Такім чынам праходзе ў курсанта рабочы час.

Астапенка

НАКАЗ ДАДЗЕН—АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ ЯГО

Кожны комсамолец павінен ведаць рашэньні зьездаў

Пастанова сходу Менскага гарактыву ЛКСМБ

Заслухаўшы даклад тав. Палякова аб выніках X усебеларускага і IX усесаюзнага зьездаў ЛКСМ, агульны сход гарадзкога актыву цалкам і поўнасьцю ўхваляе і далучаецца да рашэньняў IX і X зьездаў.

Агульна гарадзкі сход актыву са здавальненьнем адзначае, што ленінскі комсамол да сваіх зьездаў прышоў ідэйна і арганізацыйна згуртаваным вакол генэральнай лініі партыі, што комсамол за гэты час, змагаючыся пад кіраўніцтвам партыі на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, якое суправаджалася абвостраным супраціўленьнем клясавых ворагаў,—выявіў сябе, як сапраўдны, надзейны памочнік партыі ў барацьбе за яе генэральную ленінскую лінію, за пяцігодку ў 4 гады, супроць клясава-варожых элемэнтаў у партыі і КСМ—правых і „левых" опортуністых.

Ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам партыі ўшчэнт разьбіў „левых" фразёраў у комсамоле тыпу Шацкіна, Стэна і інш., нанёс рашучы ўдар правым опортуністым—найбольш небясьпечным, якія енчылі аб безактыўнасьці комсамолу, „крызісе актыву, таптаньні на адным месцы" і г. д.

Актыўна ўдзельнічаючы на ўсіх вучастках разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва, ленінскі комсамол з асноўным зьдзейсьніў паварот тварам да нашыраната перыяду рэконструкцыі, перамог адставаньне ад тэмпаў сацрэконструкцыі краіны.

Замацаваць гэты паварот, згуртаваць увагу ўсіх комсамольцаў і мас працоўнай моладзі на галоўных вузлавых вучастках гаспадарчага будаўніцтва, якімі ва ўмовах Менскай арганізацыі зьяўляюцца: рэорганізацыя транспорту, энэргетыка, капітальнае будаўніцтва, рацыяналізацыя і пляна-ваньне, мэліорацыя, торф, удзел ва ўнутрыколгасным і саўгасным будаўніцтве, рэконструкцыя сельскай гаспадаркі і ператварэньне яе з спажывецкай у вытвараючую мяса, малако, садовіну і гародніну для рабочага забясьпячэньня і падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны.

Узнагарода комсамолу ордэнам Чырвонага сьцягу ставіць перад комсамолам задачу па-баявому мобілізавацца, каб забясьпечыць тэмпы 3-га рашаючага году пяцігодкі, узьняць на вышэйшую ступень соцспаборніцтва і ўдарніцтва (скразныя брыгады, вытворча-бытавыя комуны і г. д.) і ахапіць ім 100-проц. комсамольцаў і моладзі, пад лёзунгам: „Кожны комсамолец павінен быць ня толькі ўдарнікам, але і ўдарнікам-рацыяналізатарам, пляновікам і тэхнікам", павысіць гаспадарчую кваліфікацыю актыву, конкрэтызаваць кіраўніцтва, наблізіўшы яго да цэху, брыгады, саўгасу, колгасу, увязваючы выкананьне ўсіх гэтых задач з выкананьнем пастановы зьезду аб 100-проц. уцягненьні рабочабатрацкай моладзі ў комсамол.

Сход са здавальненьнем сустракае пастанову IX зьезду УсеЛКСМ аб узаемным шэфстве над вайскова-паветранымі сіламі і падкрэсьлівае, што ў выніку з гэтым паўстаюць яшчэ больш сур'ёзныя задачы, якія абавязваюць кожную комсамольскую ячэйку, кожны комсамольскі колектыў, улічваючы правядзеньне вайсковага тыдзейка, абвешчанага Менгаркомам, ліквідаваць прарыў на фронце вайсковай працы комсамолу, вылучыць лепшых комсамольцаў, рабочых, батракоў, беднякоў і колгасьнікаў у вайсковыя школы і разгарнуць работу па збору сродкаў на пабудову і стварэньне комсамольскага зьвяна самалётаў.

Разам з гэтым комсамольскі актыў гор. Менску заклікае ўсю арганізацыю Беларусі больш сталя вывучаць работу зарубежнага комсамолу, наладзіць шчыльную сувязь з яго паасобнымі секцыямі і шырэй разгарнуць збор сродкаў на карысьць зарубежнага комсамолу, што павінна даць рашаючы пералом у ва ўсёй пастаноўцы інтэрнацыянальнага выхаваньня комсамолцаў і ўсёй працоўнай моладзі.

Барацьба комсамолу на франтох соцыялістычнага будаўніцтва павінна быць непадзельна зьвязана з задачай узьняцьця клясава-політычнай баяздольнасьці комсамолу, у барацьбе за генэральную лінію партыі супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, з „левымі" загібамі, двурушнікамі, бясспрынцыпным права-„ляўцкім" блёкам, вялікадзяржаўным шовінізмам—галоўнай небясьпекай, контррэволюцыйным нацдэмократызмам і шовінізмамі розных колераў, за разьвіцьцё нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу культуры. Марксыцка-ленінская тэорыя заўжды была і ёсьць лепшай праводнаю зоркай партыі і комсамолу ў яго бязьлітаснай барацьбе з опортуністымі ўсіх колераў, за канчатковую перамогу соцыялізму. І таму пастановы 9 і 10 зьездаў, накіраваныя на тое, каб наладзіць політвыхаваўчую працу ў комсамоле, прыстасаваць яе да запатрабаваньняў рашаючага 3 году пяцігодкі, абавязваюць стварыць шырокі масавы агляд усёй політвыхаваўчай сыстэмы і становішча політвучобы ў комсамоле.

Лічачы абавязковым для кожнага комсамольца, кожнага маладога рабочага і сяляніна сталае вывучэньне рашэньняў 9 і 10 зьездаў комсамолу, гарактыў ухваляе пастанову Менгаркому ЛКСМБ б правядзеньні політбою па выніках зьездаў. Сход актыву абавязвае ўсе комсамольскія ячэйкі як найлепей падрыхтавацца да політбою.

Сход актыву г. Менску ад імя буйнейшай комсамольскай організацыі Беларусі запэўнівае ЦК УсеКСМ і ЛКСМБ, што Ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам партыі аддасьць усю сваю сілу, волю, энэргію, юнацкі запал і політычна-клясавую сьвядомасьць за справу канчатковай перамогі соцыялізму.

ПАД УДАРАМІ КРЫЗІСУ

Францыя

Орган цяжкай прамысловасьці „Юзін" у дадатку адзначае, што экономічны крызіс ва Францыі ўсё больш охоплівае мэталюргічную прамысловасьць. Па словах газэты, вялікая колькасьць мэталюргічных заводаў вымушана ня толькі скараціць час працы, алі і звальняць рабочых.

„Юзін" адзначае далей, што новым сьведкай абвастрэньня крызісу зьяўляецца дэфіцыт буйных чыгунак.

Англія

Колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных на 26 студзеня ў Англіі складае 2.592.650 чалавек, г. зн. на 15.756 менш, чым тыдзень назад і на 1.101.131 чалавек больш, чым год назад.

Чэха-Славакія

На нарадзе соцыял-фашысцкіх профсаюзаў тэкстыльшчыкаў якая адбылася ў Празе констатавана, што тэкстыльная прамысловасьць Чэха-Славакіі ў стане поўнага развалу. Па апошніх даных, спыніла работу з прычыны крызісу каля 300 тэкстыльных прадпрыемстваў. Паступаюць весткі аб бурных дэмонстрацыях беспрацоўных у шэрагу гарадоў Чэха-Славакіі, дзе адбываліся крывавыя сутычкі з жандармерыяй

Польшча

Экспорт тэкстыльных тавараў з Бельску (Цешынская Сілезія) скараціўся на 34 проц. ў параўнаньні з 1929 г. у 1930 г. вывезена тавараў на суму толькі 13 з чверткаю млн. злотых супроць 20 млн. злотых у 1929 г.

Бюджэт голаду, тэрору і вайны

ВАРШАВА, 8. У сойме, у спрэчках па бюджэту, выступіў тав. Рожэк,—адзіны комуністычны дэпутат, які прысутнічаў на бюджэтных спрэчках, бо два астатнія таварышы, Бужынскі і Дунецкі, выключаны з сойму на адзін месяц за свае рэволюцыйныя выступленьні.

„Бюджэт прапанаваны сойму,—заявіў тав Рожэк,—гэта—бюджэт голаду, тэрору і вайны. Трэцяя частка усяго бюджэту ідзе на падрыхтоўку вайны супроць СССР. Фактычна-ж выдаткі на армію значна большыя, складаючы амаль палову ўсіх бюджэтных выдаткаў".

„У польскай вёсцы,—гаворыць далей тав. Рожэк,—жабрацтва і голад. Нябывалыя разьмеры тэрору. Аднак сяляне не дазволяць біць сябе беспакарана, як караюць карныя экспэдыцыі маршала Пільсудзкаг Рэволюцыйная сьвядомасьць вёс прабуджаецца і нарастае. Усё час цей і часьцей сяляне выступаюць с проць падатковага рабунку, праганя юць прэч судовых выканаўцаў, вы ступаюць у бой з паліцыяй".

Тав. Рожэк закончыў сваю пр мову словамі: „Рукі прэч ад ССС далоў імпэрыялістычную вайну с проць СССР; вашаму ўраду гола тэрору, вашым ваенным падры тоўкам рабоча-сялянскія масы Пол шчы працiпастаўляюць сваю рэвол цыйную барацьбу супроць фашыс кай дыктатуры і яе агентаў, супро вайны, у абарону СССР і за Саве кую Польшчу".

Час. вык. абав. адк. рэдактара
С. АНІСА

11-га лютага пачынае сваю працу

1-я агульна-гарадзкая конфэрэнцыя рабочай моладзі Менску

з наступным парадкам дню:

1. Вынікі IX і X зьездаў ЛКСМ, 2. Вынікі выкананьня пляну ўдарнага кварталу і першага месяцу 3-га рашаючага году. 3. Садаклад аб становішчы і рацыяналізацыі плянава-опэрацыйных груп, 4. Пастанова журы аб пераходным сьцягу Гаркому ЛКСМБ і ВСНГБ.

Модус прадстаўніцтва 1 дэлегат ад 10 чалавек.

МЕНГАРКОМ ЛКСМБ

---

10 лютага, а 7 гадзіне ўвечары, ў Доме Пісьменьніка (Савецкая, 68) адбудзецца

агульны сход Менскай філіі БелАПП'у

разам з таварыствам літаратуразнаўцаў-марксыстых.

На парадку дня:

1. Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру (дакл. т. Я. Ліманоўскі).

2. Аб выбарах акадэмікаў у БАН (дакл. т. Шчарбакоў).

На сход павінны зьявіцца члены БелАПП'у, члены таварыства літаратуразнаўцаў-марксыстых, члены літстудыі БелАПП'у, члены рабочых літаратурных гуртков, члены сэкцыі нарысу.

Запрашаюцца студэнты комвузу, асьпіранты-літаратуразнаўцы, мастакі, беларуская і яўрэйская капэлі, ансамбль народных інструмантаў.

Менская Гар. КК КП(б)Б—РСІ паведамляе, што 11/II—31 г., а 6 гадзіне ўвечары, у клюбе Харчавікоў (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай) склікаецца шырокая гарадзкая нарада заводашэфаў і падшэфных установ па пытаньню:

Аб чарговых задачах масавай працы КК РСІ і рабочага шэфства над дзяржапаратам.

На нараду павінны зьявіцца сэкратары парт. кол-ваў і ячэяк, старшыні ФЗМК, шэфбрыгады, трохкутнікі падшэфных установ, рабселькоры, „лёгкія кавалерыстыя", прадстаўнікі насьценгазэт і шматтыражак.

На нараду таксама запрашаюцца прадстаўнікі ЦКК НК-РСІ, Гаркому КП(б)Б, Гаркому ЛКСМБ, ЦСПСБ, ЦП саюзаў, і ўсіх рэдакцый газэт: „Зьвязда", „Рабочий", „Чырвоная Зьмена", „Савецкая Беларусь".

З прычыны важнасьці пытаньня, неабходна своечасова паведаміць усіх вышэйадзначаных т. т. Адказнасьць за своечасовую яўку на нараду ўскладаецца на сэкратароў парт. кол-ваў і ячэек КП(б)Б.

Мен. Гар. КК КП(б)Б—РСІ
Старшыня МГКК (Кеніг)

Ільлічоў

Вынікі IX зьезду УсеЛКСМ і задачы армейскага комсамолу*)

Быць кіраўнікамі справы, а ня слова.

„Вялізарнейшыя задачы, што стаяць перад нам, ставяць павышаныя патрабаваньні і да кіраўніцтва. Нельга зараз кіраваць наогул. Сёньня кіраўніцтва павінна аўладаць ня толькі агульнымі ведамі, але ясна ўяўляць сабе ўсе мясцовыя, культурныя, геаграфічныя і іншыя асаблівасьці. Сёньня сэкратар, ды ня толькі сэкратар, а і ўсе кіруючыя органы павінны ўзброіцца рудою, стальлю, жалезам, электрычнасьцю, тэкстылем, колгасамі, саўгасамі, нафтаю, машыннай тэхнікай—вось, што трэба". (Косараў — справаздача ЦК IX зьезду). Для нас гэтая ўстаноўка таксама першачарговая. Каб умець кіраваць, трэба конкрэтна ведаць работу ўсіх вінцікаў нашага складанага мэханізму. Трэба ўмець конкрэтна вывучаць работу па яе паасобных галінах, дыфэрэнцыяваць сваё кіраўніцтва кожнай ячэйкай ня толькі па становішчу работы, але і па яе асаблівасьцях—гаспадарнікі, кулямётчыкі, артылерыстыя, хамікі, сувязістыя і г. д., ня стрыгчы ўсё і ўся пад агульны грэбень, а пэўна і конкрэтна даваць указаньні, вывучаючы ня толькі ўвогуле і цалкам, але і як працуе кожны комсамолец паасобку. Трэба ведаць і здолець так раставіць свае сілы, каб яны забясьпечылі асноўныя, рашаючыя вучасткі нашай работы.

Кожны наш актывісты, кожны кіраўнік павінны зараз ня толькі добра гаварыць, а галоўнае ўмець арганізоўваць масы, падаваць лепшыя прыклад у баявой падрыхтоўцы, быць перадавым ударнікам, умела вызначаць конкрэтнае зьвяно работы на сёньнешні дзень у сваёй часьці, у сваім падразьдзяленьні, практычна, на справе організоўваць масы на правядзеньне генэральнай лініі партыі, на барацьбу з опортунізмам.

Не пераймаць мэханічна новыя формы і мэтоды працы

Вельмі часта, выявіўшы прарыў ва ўдарнай часьці практычнай работы, мы ўзьнімаем агульную шуміху, наогул мобілізуем масы, але не знаходзім конкрэтнага зьвяна, таго зьвяна, якое зьяўляецца прычынай прарыву. У выніку—ўзьнятая шуміха б'е міма цэлі.

Дыфэрэнцыяцыя і конкрэтызацыя кіраўніцтва павінны быць праведзены зьверху данізу. Бяз гэтага немагчыма рухацца ўперад.

Пытаньні нашай пасьпяховай работы ўпіраюцца ў перабудову. Яшчэ вельмі многія таварышы не разумеюць, што сутнасьць перабудовы заключаецца ня ў тым, каб вы умаць нейкую новую назву формы работы, а ў тым, каб здолець своечасова стаць на чале актыўнасьці мас, накіраваць яе на ліквідацыю сёньнешняга конкрэтнага недахопу.

Тав. Гамарнік на нарадзе ваенных дэлегатаў 9 зьезду ў ПУР'ы асабліва рэзка падкрэсьліў, што для нас надзвычайна шкодна, калі мы мэханічна, бяз уліку нашых спэцыфічных асаблівасьцяй Чырвонай арміі, пераносім формы і мэтоды работы заводаў, і вельмі часта захапляемся прыгожай назвай—гэта зусім правільна. Ні адна форма работы нашых фабрык і заводаў не павінна пераносіцца без папярэдняга, глыбокага прадумваньня, як яе дапасаваць да ўмоў Чырвонай арміі.

Зьезд асабліва падкрэсьліў, што нам неабходна ўзмацніць выхаваўчую работу сярод комсамолу. Гэта задача нямеціш востра стаіць у нас у Чырвонай арміі. Справа выхаваньня ня можа зараз абмяжоўвацца толькі гурткамі, яна павінна быць пастаўлена куды шырэй і праводзіцца штодня у кожнай практычнай рабоце.

Мы зараз перажываем цяжкасьці нашага росту. Вельмі многа ў асяродзьдзі нашых комсамольцаў блытаніны, неразуменьня. І ня толькі таму, што ў комсамольца загаварваюць дробнабуржуазныя пачуцьці, а таму, што яму своечасова не растлумачаць, не папрацуюць з ім. Таму задача комсамолу так паставіць сваю работу, каб ведаць кожнага комсамольца, чым ён жыве, дыхае, ведаць яго сумненьні, хістаньні і ідэйна яго выхоўваць, своечасова прыйсьці яму на дапамогу ў яго сумненьнях і хістаньнях... Трэба паставіць персональную ідэйна-выхаваўчую работу" (Кагановіч).

Мацней сувязь армейскага комсамолу з грамадзянскім.

Выкананьне ўсіх гэтых задач немажліва без павялічэньня шэрагаў комсамолу. IX зьезд у дакладзе тав. Косарава так вызначыў задачу росту: „Мне здаецца, што тэндэнцыя нашага росту будзе заключацца ў тым, што ў бліжэйшыя гады наш ленінскі комсамол будзе налічваць у сваіх шэрагах ня 3 мільёны, а прыкладна мільёнаў 8 ці 10... І задача кіраўніцтва—не спадзявацца на самацёк, а мець на ўвазе што ўсё нашае папярэдняе разьвіцьцё падрыхтавала гэты процэс. Мы павінны сказаць: далоў самацёк у росьце" (Косараў—Справаздача ЦК).

З пытаньнямі росту ў нашай акрузе справа стаіць ня зусім добра і ў адносінах тэмпу і ў адносінах якасьці, а ў шэрагу месц трэба проста біць трывогу. Мобілізаваць зараз-жа ўсе свае сілы на ўзмацненьне тэмпаў росту, на палепшаньне яго якасьці, на хутчэйшае выкананьне лёзунгу „100% рабочых і батракоў—у комсамол", максымальна ўцягваючы колгасьнікаў і беднякоў—гэта асноўная задача.

Армейскі комсамол зараз праводзіць свае дывізійныя конфэрэнцыі. Нашы задачы ясныя. Тав. Гамарнік у сваім выступленьні на нарадзе ваенных дэлегатаў IX зьезду падкрэсьліў, што комсамол павінен зараз пад кіраўніцтвам партыі мобілізаваць усе свае сілы на выкананьне загаду Рэўваенсавету, на павышэньне дысцыпліны, на поўнае аўладаньне тэхнікай і асабліва яе зьберажэньнем, дабіўшыся бальшавіцкіх адносін да зброі, не на словах, а на справе ўзяцца за выкананьне гэтых задач.

Зьезд намеціў разгорнутую програму работы комсамолу таксама і на вёсцы. Асноўнае для армейскага комсамолу — дабіцца хутчэйшага выкананьня задачы 100-проц. уцягненьня комсамолу ў колгасы, максымальна разгарнуць работу па ўзмацненьню колгасаў, організацыі працы. прыблізіцца да грамадзянскага комсамолу.

*) Канец. Пачат. гл. № 32 „ЧЗ".

Бярэце прыклад

Комсамолец ячэйкі Сампрамсаюзу гор. Слуцку Сіпаковіч, які меў заданьне распаўсюдзіць сярод саматужных арцеляй і вячэрніх школ рабочай моладзі 290 экзэмпляраў „Чырвонай Зьмены" з гонарам выканаў і перавыканаў гэтае заданьне—завербаваўшы 300 падпісчыкаў, значная колькасьць якіх—гадовыя.

Тав. Сіпаковіч абяцае ў далейшым не паслабляць тэмпу распаўсюджваньня „Чырвонай Зьмены". С.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599